*А. В. Гаўрыкаў*
Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, Мінск

*A. Gavrikov*
Institute of Sociology of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК 329.05**

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ У ДЫСКУРСЕ ПАЛІТЫЧНАЙ САЦЫЯЛОГІІ

# FORMATION OF THE DEVELOPMENT OF RESEARCH OF POLITICAL PARTIES IN THE DISCOURSE OF POLITICAL SOCIOLOGY

*У артыкуле разглядаюцца тэарэтыка-метадалагічныя асновы станаўлення і развіцця даследавання палітычных партый у палітычнай сацыялогіі. Паказаны асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы вывучэння палітычнай партыі ад пачатку XVIII ст. да XXI ст. Аналізуюцца новыя тэндэнцыі і перспектывы вывучэння палітычных партый у дыскурсе палітычнай сацыялогіі.*
*Ключавыя словы: палітычная партыя; палітычная сацыялогія; парталогія.*

*In an artykulya razgalydayayutstsa tearetyka-metadalagnichnyy asnovy satsyalagnichna stanaўlennya dasledavannya pal_tychnyh desy at the palitychnaya satsyalogii. Asacons tearetyka-metadalagic padykhody vyvuchennya pitychnyya party hell patchatka 18st. And yes 21st. Analizzyutstsa new tendentsi i prospects of vyvuchennnya pitychnyh desyby u palytichnay satsyyalogii.*
*Keywords: palytychnaya partyya; palittychnaya satsyalogiya; partylogia*

У даследчыкаў, якія вывучаюць пытанне развіцця палітычных партый, існуюць значныя разыходжанні меркаванняў пра тое, калі з’явіўся гэты сацыяльна-палітычны інстытут. Адны лічаць, што правобразы сучасных палітычных партый былі яшчэ ў антычнасці ў выглядзе асобных палітычных груп, якія абаранялі інтарэсы сваіх прыхільнікаў (у радзе старэйшын, Кансулаце, Сенаце і іншых органах прадстаўнічай улады). Іншыя, насупраць, лічаць, што правобразам палітычных партый паслужылі палітычныя групы і аб’яднанні новага часу XVI–XVIII стст., якія з’явіліся ў перыяд буржуазных рэвалюцый, узмацнення ролі парламента і распаўсюджання ўсеагульнага выбарчага права. Палітычныя партыі вывучаюць шмат кірункаў: правазнаўства, філасофію, паліталогію і інш. Адным з навуковых кірункаў, які закранае партыі, з’яўляецца палітычная сацыялогія.

Як новы кірунак сярод грамадскіх навук палітычная сацыялогія з’явілася ў пачатку XX ст. у ЗША і Заходняй Еўропе. Аб’ектам яе вывучэння сталі сацыяльныя механізмы палітычных паводзін індывідаў, сацыяльных слаёў і груп, этнічных і канфесійных супольнасцей, дзейнасць палітычных партый

і грамадскіх рухаў, іншых палітычных структур, іх сацыяльна-палітычных патрэбаў, інтарэсаў, дзеянняў.

Палітычную сацыялогію можна вызначыць як вобласць сацыялогіі, якая вывучае заканамернасці ўзаемадзеяння і іх структур, сацыяльныя аспекты рэгулявання палітычных працэсаў і адносін, сацыяльныя фактары фарміравання і функцыянавання палітычнай сацыялогіі. У палітычнай сацыялогіі ў паліталогіі ў тэрміна «палітычная партыя» няма агульнапрынятага вызначэння, адсутнічае і адзінства падыходаў да разумення яе сутнасці. Па дадзеных расійскага даследчыка З. М. Зотавай, толькі ў рускамоўнай літаратуры налічваецца больш за 200 вызначэнняў палітычнай партыі [1]. Разглядаючы палітычную партыю як сацыяльна-палітычны інстытут, мы паспрабуем даць асабістае вызначэнне палітычнай партыі ў палітычнай сацыялогіі.

Адны́мі з першых, хто падняў пытанне палітычнага дзялення грамадства на палітычныя групы, з'яўляюцца старажытнагрэчаскія і рымскія філосафы: Платон, Арыстоцель, Палібій, Цыцэрон, Плаўцій, Солюсцій і інш. Для іх партыяй (лат. *pars* – частка чаго-небудзь) з'яўлялася група людзей, аб'яднаная якой-небудзь мэтай альбо вакол палітычнага лідара [2].

Аднак палітычная партыя сваё значэнне ў сучасным сэнсе гэтага слова, на наш погляд, набыла толькі пасля распаўсюджання ўсеагульнага выбарчага права, станаўлення парламентарызму і буржуазных рэвалюцый XVIII ст. У гэты час даследчыкі звярнулі пільную ўвагу на вывучэнне палітычных партый як сацыяльна-палітычнага інстытута і важны элемент дасягнення грамадзянскай супольнасці.

Першыя працы, якія закранаюць менавіта развіццё палітычных партый, з'явіліся ў XVIII ст. і развіваліся ў галіне палітычнай філасофіі. У Англіі у 1741 г. было апублікавана эсэ «About parties in general» [3] англійскага даследчыка Дэвіда Юма. У ім ён упершыню класіфікаваў палітычныя партыі на асабістыя і рэальныя. Ім быў прадпрыняты псіхалагічны падыход да класіфікацыі, пры якім падтрымка асабістых палітычных партый будавалася на сімпатыі і антыпатыі да яе, а падтрымка рэальных партый засноўвалася на патранажы інтарэсаў і матэрыяльных выгад выбарніка, пры гэтым у яго адбывалася псіхалагічная барацьба аддаць голас упадабанай партыі ці галасаваць рацыянальна свайму матэрыяльнаму становішчу.

Першая спроба даць вызначэнне, што такое палітычная партыя, была прадпрынята французскім грамадска-палітычным дзеячам Бенжамінам Канстантам. Будучы пазафракцыйным дэпутатам у Генеральных Штатах, ён выдзяліў дактрынальнае вызначэнне палітычных партый: «партыя ёсць агульнасць людзей, якія публічна вызнаюць адну і тую ж палітычную дактрыну» [18]. Ім быў вызначаны ідэалагічны падыход да вывучэння палітычных партый (які выкарыстоўваецца і зараз).

Адным з першых, хто звярнуў увагу на дыялектычны характар фарміравання і трансфармацыі партый, з'яўляўся нямецкі філосаф

Іозеф Разенкранц. У працы «Der Ursprung des Konzepts der politischen Partei» 1843 г. [4]. Ён разглядаў палітычную партыю як арганізацыю развіцця пад дзеяннем унутраных супрацьлегласцяў, якія ўяўляюць сабой рознагалоссі паміж групамі і асобнымі чальцамі партыі. Яны дапушчальныя, пакуль не расколваюць партыю, гэта значыць, натуральная мяжа партыйнай дэмакратыі складаецца ў захаванні адзінства шэрагаў партыі. Пры гэтай умове партыйныя дыскусіі выконваюць пазітыўную функцыю, служаць далейшаму развіццю партыйнай ідэалогіі і партыйнай арганізацыі. Ён першым падняў пытанне наконт дзеяння палітычнай партыі ў дэмакратычнам грамадстве.

Палітычныя партыі сучаснага тыпу з’яўляюцца ў XIX–XX стст. (пераважна ў Заходняй Еўропе, ЗША і з прыкметным спазненнем – у Расійскай імперыі). У гэты час пачынае афармляцца і новы кірунак – палітычная сацыялогія, з якой у пачатку XX ст. вылучылася сацыялогія палітычных партый. У 1838 г. з’яўляецца праца «De la démocratie en Amérique» [5] вядомага правазнаўца Алексіса дэ Токвіля, дзе ён разглядаў пытанні сістэмы пакарання ЗША. Даследчык шырока выкарыстаў метад інтэрв’юіравання, размаўляючы з партыйнымі функцыянерамі і лідарамі палітычных партый ЗША. Ён першым класіфікаваў палітычныя партыі на буйныя і малыя. Буйныя партыі (часцей за ўсё ўлады) – гэта партыі, якія могуць быць ва ўладзе і праводзіць (па яго меркаванні) правільную палітыку ў інтарэсах большасці народа. Малыя – гэта партыі, якія выказваюць інтарэсы вузкай групы людзей або аднаго чалавека і перашкаджаюць буйным партыям праводзіць правільную палітыку. Вывучаючы палітыную сістэму краіны, ён закрануў працэс дзейнасці палітычных партый, іх станаўленне і развіццё перш за ўсё з пазіцыі канстытуцыйнага права. Палітычныя партыі даследчыкам разглядаліся як інстытут, спароджаны выбарчым правам і ліберальна-дэмакратычным рэжымам краіны.

У 1903 г. у Парыжы выйшла фундаментальная праца рускага палітолага і сацыёлага, заснавальніка сацыялогіі палітычных партый Міхаіла Якаўлевіча Астрагорскага «Демократия и политические партии» [6]. У цэнтры тэарэтыка-метадалагічных даследаванняў вучонага ўпершыню апынуўся аб'ект – палітычныя партыі. Ім былі закладзены асновы навуковага разумення інстытута «палітычная партыя». Аснову яго працы склаў аналіз станаўлення і развіцця палітычных партый ЗША і Вялікабрытаніі. М. Я. Астрагорскі ўпершыню закрануў пытанні супярэчнасці прынцыпаў дэмакратыі і дзейнасці інстытута партый. На прыкладзе палітычнай барацьбы «айцоў-заснавальнікаў» ім была паказана магчымасць кіруючых эліт маніпуліраваць воляй выбаршчыка. Галоўнай праблемай палітычных партый вучоны лічыў іх бюракратызацыю і фармалізацыю ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі ў ходзе барацьбы за ўладу, у выніку чаго з’яўляюцца лабісцкія групы, якія шляхам выкарыстання (часта незаконнага) выбарчых тэхналогій спрабуюць атрымаць дамінуючае становішча ў палітычным полі.

М. Я. Астрагорскім ўпершыню былі выкарыстаны сацыялагічныя метады для аналізу дынамікі развіцця палітычных партый: глыбінныя інтэрв'ю, фокус-групы і кантэнт-аналіз партыйных дакументаў. Ён сустракаўся з вядучымі палітыкамі і дзяржаўнымі дзеячамі, якія дзяліліся з ім сваім вопытам палітычнай барацьбы і пабудовай сваіх праграмных установак для дасягнення палітычных мэтаў.

З'яўляючыся членам англійскай грамадскай юрыдычнай палаты, М. Я. Астрагорскі ўдзельнічаў у абмеркаванні дзяржаўнай палітыкі па адносінах да палітычных партый, ім былі ўзняты пытанні наконт ролі палітычных эліт у палітыцы ў краінах з дэмакратычным рэжымам, у выніку чаго была паказана ангажаванасць многіх палітыкаў, якія знаходзяцца ва ўладзе. З дапамогай кантэнт-аналізу былі вывучаны праграмы вядучых палітычных партый у ЗША і Вялікабрытаніі, дзе вучоны паказаў практычную ідэнтычнасць палітычных мэтаў партый, розніца якіх складалася толькі ў ідэалагічных установках і рэгіянальных асаблівасцях палітыкі партый.

Грунтоўна закранута пытанне з пункту гледжання паліталогіі і палітычнай сацыялогіі (двойчая партыйнасць) у краіне ў працы брытанскага юрыста і палітолага Сіднэя Лоў «Government of England» (1908 г.) [7]. Даследчык адзначыў, што падзел на партыі з'яўляецца істотнай асаблівасцю англійскага канстытуцыйнага механізму. Англійская сістэма кіравання мяркуе наяўнасць толькі дзвюх партый (пры нязначным становішчы астатніх). Усе спробы скапіраваць яе, акрамя ЗША, у іншых краінах са шматпартыйнымі сістэмамі завяршыліся няўдала, тым самым даследчык вылучаў прынцып гістарызму развіцця палітычных партый у англасаксонскіх краінах.

У 1905 г. у перыяд рэвалюцыйных змен і лібералізацыі палітычнага рэжыму ў Расійскай імперыі юрыстам Ю. С. Гамбаравым было закранута пытанне палітычных партый у парламенцкай сістэме. У выніку параўнальнага аналізу замежнага вопыту ўзаемадзеяння палітычных партый у заканадаўчых і прадстаўнічых органах улады ім была выдадзена кніга «Политические партии в их прошлом и настоящем» (1905 г.) [8]. Выкарыстоўваючы інстытуцыянальны метад, Ю. С. Гамбараў разглядаў заканадаўчую інстытуцыяналізацыі палітычных партый і заканадаўчае рэгуляванне іх дзейнасці. У ёй быў закрануты працэс развіцця палітычных партый і іх дзейнасць пры сістэме парламентарызму. Разглядаючы барацьбу палітычных партый у парламенце, аўтар прыйшоў да лагічнай высновы, што чым больш ліберальная палітыка ў адносінах да палітычных партый, тым больш аўтарытарныя палітычныя партыі па сваёй структуры, пры гэтым самі палітычныя партыі з'яўляліся вынікам палітычнай мадэрнізацыі краіны. Ю. С. Гамбараў класіфікаваў палітычныя партый па адносінах да парламента краіны: партыі парламенцкія і пазапарламенцкія. Гэтак жа ім былі выдзелены прававы падыход класіфікацыі партый ў адносінах да ўлады: легальныя (зарэгістраваныя), нелегальныя (незарэгістраваныя) і

паўлегальныя (зарэгістраваныя партыі, але якія выкарыстоўваюць нелегальныя метады палітычнай барацьбы).

Для абгрунтавання паняцці партыі ім было вызначана пяць прыкмет:

- партыя – гэта грамадская група;
- партыя – не юрыдычны, а сацыяльны факт;
- свабодная грамадская арганізацыя;
- сучасныя палітычныя партыі ўтвараюцца толькі ў прававой дзяржаве і не могуць існаваць у бездзяржаўных грамадствах;
- мэтай партыі з'яўляецца заваёва ўлады, адсюль такія яе прыкмета, як сумеснае палітычнае дзеянне;
- членаў партыі аб'ядноўвае агульнасць інтарэсаў, ідэй.

Пытанні функцыянавання і дзейнасці палітычных партый разглядалі заснавальнікі і прыхільнікі марксізму К. Маркс, Ф. Энгельс. Марксізм аказваў значны ўплыў на партыйнае будаўніцтва ў XX ст. У працы «Deutsche Ideologie» (1846) [9] яны вылучылі класавы падыход у сацыялогіі, імі былі вылучаны грамадскія групы прыхільнікаў феадалізму, буржуазіі і рабочых, якія сталі асновай агрэгацыі палітычных інтарэсаў гэтых груп у партыйным будаўніцтве. Імі ў перадумовах стварэння палітычных партый быў вылучаны класавы падыход, пры якім партыя выяўляла інтарэсы перш за ўсё сацыяльна-палітычнага класа і яго эканамічныя і палітычныя інтарэсы, што стала асновай марксісцкага падыходу ў вывучэнні палітычных партый.

Пытанне дзейнасці палітычных партый у Расійскай імперыі разглядаў паслядоўнік марксізму У. І. Ленін у працы «Опыт классификации русских политических партий», дзе ў т. 14 і т. 15 было закранута пытанне канцэпцыі чаргавання партый ва ўладзе ў пераходны рэвалюцыйны перыяд. Праца абапіраецца на марксісцкі падыход, вылучаны заснавальнікамі марксізму К. Марксам, Ф. Энгельсам. У. І. Ленін развіў тэарэтычныя ўяўленні класавага падыходу. Ім былі разгледжаны магчымасці інстытуцыяналізацыі апазіцыйнай партыі Расійскай імперыі на прыкладзе ультралевых палітычных партый. У. І. Ленін зрабіў спробу класіфікацыі партыі Расійскай імперыі 1905–1917 гг. Ён дапоўніў класавы падыход ідэалогіяй (якая, на яго думку, мела ключавое значэнне ў палітычнай барацьбе).

У працы нямецкага сацыёлага М. Вэбера «Politik als Beruf und Berufung» [11] была закранута ўнутраная структура палітычных арганізацый. Ён вызначаў палітычную партыю як сацыяльную арганізацыю, мэта якой – заваёва ўлады для сваіх кіраўнікоў. У сістэме палітычнай арганізацыі ім была выдзелена агрэгацыя палітычных інтарэсаў калектыўнай і асабістай выгады. М. Вэбер вылучыў у грамадстве палітычныя асацыяцыі: часовыя для дасягнення бліжэйшых кароткатэрміновых мэтаў і пастаянныя для дасягнення працяглых мэтаў.

У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, М. Вэбер лічыў, што арганізацыі палітычнага тыпу могуць з'явіцца раней за ўсеагульнае выбарчае права. Ім упершыню былі вылучаны групы ідэалагічнай цікавасці і патранажныя:

першыя групы цікавасці выказваюць палітычныя патрабаванні (саслоўя, класа, якога-небудзь рэгіёна), другія – змагаюцца за ўладу для сваіх кіраўнікоў і дамінаванне ў палітычным полі.

Дадзеныя высновы давалі магчымасць разглядаць палітычныя партыі як сацыяльны інстытут з пункту гледжання партый аднаго чалавека – лідара або партыі грамадскіх аб'яднанняў інтарэсаў, якія часта пры дасягненні пастаўленай мэты знікаюць.

Пытанне ўзаемадзеяння супольнасці і палітычных партый у дэмакратычным рэжыме ў працы «Zur Soziologie des Parteiwesens in der der Modernen Demokratie» [12] закранаў Роберт Міхельс. У пачатку XX ст. ён на прыкладзе сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі разглядаў пытанне функцыянавання палітычнай партыі ў дэмакратычным рэжыме. Партыі сацыял-дэмакратычнага кірунку ў заходняй Еўропе пачатку XX ст. прэтэндавалі на выраз інтарэсаў самых шырокіх слаёў грамадства і ў першую чаргу рабочага і сялянскага класа. Да пачатку XX ст. большасць даследчыкаў традыцыйна лічылі сацыял-дэмакратычныя партыі найбольш дэмакратычнымі, і Р. Міхельс, будучы прыхільнікам пазітывізму, паспрабаваў эмпірычнымі метадамі (назіранне, анкетаванне і інтэрв'ю) вызначыць, наколькі гэта адпавядае рэчаіснасці. У выніку сваіх даследаванняў навуковец прыйшоў да высновы, што народныя масы ў сваёй сукупнасці не могуць кіраваць сабой, а палітычныя партыйныя эліты заўсёды дыстанцыіруюцца ад простых членаў палітычных партый. Падставай для гіпотэзы вучонага паслужылі працы па даследаванні палітычных эліт Г. Москі і С. Парэта, якія разглядалі пытанне адкрытых і закрытых палітычных эліт.

Р. Міхельс вызначыў выразную структуру для эфектыўнай дзейнасці партыі – кіраўнічы апарат. Для камунікацыі з электаратам і з іншымі палітычнымі арганізацыямі партыйная эліта павінна валодаць спецыяльнымі ведамі і навыкамі (якімі радавыя члены партыі часцей за ўсё не валодалі), што ўжо падзяляе членаў палітычных партый па службовых абавязках і ролі, якую яны выконваюць у арганізацыі. Р. Міхельс вылучыў партыйную эліту, якая мае навыкі кіраўнічай дзейнасці, лепш інфармаваная і кантралюе арганізацыйную структуру і фінансавыя сродкі партыі.

На яго думку, партыйная эліта імкнулася не столькі дасягнуць палітычных мэтаў, колькі ўтрымаць кіруючае становішча ў партыі і звязаных з гэтым пераваг. На прыкладзе палітычных праграм сацыял-дэмакратаў, мэтай якіх было пераўтварэнне грамадства на прыкладзе сацыяльнай справядлівасці і сацыяльнай роўнасці, як заўважыў Р. Міхельс, «партыйная эліта шмат у чым ужо дамаглася для сябе пастаўленай мэты і фактычна ўжо з'яўлялася палітычнай элітай, якой якія-небудзь сацыяльна-палітычныя змены не былі так ужо і патрэбныя». Р. Міхельс выказаў тэорыю, у адпаведнасці з якой сацыял-дэмакратычная партыя не з'яўляецца той дэмакратычнай арганізацыяй, якой яна пазіцыянавала сябе на палітычнай прасторы. У рэчаіснасці ўлада, на думку вучонага, належала вузкаму колу

алігархічнай партыйнай эліты, якая не імкнулася дзяліцца паўнамоцтвамі і ўладай ўнутры партыйнай структуры. Высновы, якія зрабіў Р. Міхельс, вядомыя як «Жалезны закон алігархіі», які, на думку яе аўтара, уласцівы ўсім палітычным партыям.

Пытанне станаўлення палітычных партый як сацыяльна-палітычнага інстытута разглядалася французскім палітычным сацыёлагам М. Дзювержэ. Вучоны ў 1951 г. напісаў фундаментальную працу «Formation politique» [13], у якой упершыню разгледзеў і абгрунтаваў класіфікацыю палітычных партый на кадравыя і масавыя, таталітарныя і спецыялізаваныя. Пры разглядзе палітычных партый ім былі вылучаны заканамернасці развіцця палітычных партый (законы М. Дзювержэ), упершыню была выказана думка аб тым, што прымяненне заходнееўрапейскай мадэлі дэмакратыі можа быць праблематычнай у іншых краінах з іншымі сацыякультурнымі асаблівасцямі і палітычнай гісторыяй.

М. Дзювержэ вылучыў тры законы развіцця палітычных партый і выбарчых сістэм:

• «прапарцыйная выбарчая сістэма спрыяе развіццю шматпартыйнай палітычнай сістэмы з дзейнасцю незалежных партый і іх жорсткай унутранай структурай;

• абсалютная мажарытарная выбарчая сістэма спрыяе станаўленню партыйнай сістэмы, у якой партыі лавіруюць і імкнуцца да ўзаемадзеяння адна з адной;

• адносная мажарытарная выбарчая сістэма спрыяе станаўленню двухпартыйнай сістэмы».

Класіфікацыя палітычных партый М. Дзювержэ атрымала назву бінарнай і з’яўляецца найбольш папулярнай у паліталогіі і палітычнай сацыялогіі заходняй Еўропы. У яе аснову пакладзены два крытэрыі падзелу партый на масавыя і кадравыя. Кадравыя партыі – гэта аб’яднанне часцей за ўсё уплывовых і багатых людзей і іх прыхільнікаў, якія не імкнуцца да павелічэння колькасці членаў сваёй партыі. Само ўступленне ў кадравую партыю мае зусім іншы сэнс: гэта акт глыбока індывідуальны, абумоўлены здольнасцямі або асаблівым становішчам чалавека. Масавыя партыі маюць разгалінаваную арганізацыйную структуру, абапіраюцца на шырокую грамадскасць, якая дазваляе выбарчай кампаніі партыі пазбегнуць залежнасці ад грошай палітычнага лідара, атрымлівае палітычнае выхаванне і набывае інструмент для ўдзелу ў дзяржаўным жыцці. Адрозненне кадравых і масавых партый абумоўлена сацыяльнай і палітычнай інфраструктурай. У асноўных рысах яно адпавядае замене абмежаванага выбарчага права ўсеагульным. М. Дзювержэ звязваў станаўленне партыйнай сістэмы з выбарчай сістэмай і юрыдычнай рэгламентацыяй дзейнасці палітычных партый. Навуковец у сваіх даследаваннях звяртаў увагу на апазіцыйныя партыі і іх барацьбу за палітычную ўладу. Адсутнасць легітымнага шляху рэкрутавання ў палітычны працэс партый другога плана, на яго думку,

звычайна прыводзіць да прадуцыравання пазасістэмных партый, нярэдка экстрэмісцкай накіраванасці.

У 1950–1960-я гг. у заходняй Еўропе і ЗША пачынаюць звяртаць больш пільную ўвагу на вывучэнне палітычных партый. Амерыканскімі і англійскімі палітолагамі і сацыёлагамі С. Ліпсатам і З. Рокканом у станаўленні палітычных партый была выдзелена нацыянальная спецыфіка складання нацыянальнай дзяржаўнасці, галоўным фактарам для даследчыкаў сталі наяўнасць супярэчнасцяў у грамадстве і дзяржаве ў цэлым.

Гэтыя канфлікты былі названыя сацыятальнымі (канфлікты найвышэйшай стадыі), якія партыі маглі накіроўваць у легальнае рэчышча палітычнай барацьбы. Даследчыкамі былі вылучаныя прыклады такіх канфліктаў: канфлікт сталіцы і рэгіёнаў; дзяржавы і царквы; горада і вёскі; уласнікаў і рабочых.

Дадзеныя канфлікты падзялялі грамадства на палітычныя групы, што, у сваю чаргу, спрыяла з’яўленню палітычных партый рознай ідэалагічнай арыентацыі, якія шмат у чым агрэгіравалі інтарэсы палітычных груп. У далейшым тэорыя сацыятальных канфліктаў была дапоўнена палітолагам Л. Джандай. На прыкладзе кампаратыўнага аналізу палітычных партый ЗША і заходняй Еўропы ён вылучаў крытэрыі вымярэння палітычных супярэчнасцяў: эканамічны статус дзяржавы; рэлігійнасць насельніцтва; этнічную аднастайнасць або не насельніцтва краіны; узровень урбанізацыі і адукацыі электарату [14].

У 1970-х гг. у сувязі з ростам палітычнай актыўнасці моладзевых палітычных арганізацый і з’яўлення новых палітычных рухаў, якія часта прыводзілі да абвастрэння пазасістэмнай палітычнай барацьбы (пры якой роля палітычных партый паступова памяншалася). Такое змяненне палітычнага поля прымусіла звярнуць увагу даследчыкаў на крызіс палітычных партый як сацыяльна-палітычнага інстытута 1970-х гг.

К. Лоўсан і Р. Далтон надалі асаблівую ўвагу скарачэнню чалавечай базы палітычных партый і памяншэнню іх ролі ў дзяржаўным кіраванні [15; 16]. У крызісным стане знаходзіліся перш за ўсё масавыя і ўсёахопныя партыі сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў, камуністаў. Гэта было абумоўлена павелічэннем ролі буйнога бізнесу, палітыкай глабалізму і з’яўленнем новых палітычных рухаў: фемінізму, ЛГБТ, зялёнай палітыкі, пацыфізму і інш., якія не імкнуліся стаць палітычнымі партыямі, але ўсё больш прыцягвалі ўвагу маладых выбаршчыкаў. Да сярэдзіны 1980-х – пачатку 1990-х гг. палітычныя партыі як сацыяльна-палітычны інстытут знаходзіліся ў сістэмным крызісе. Пытанні вывучэння дынамікі развіцця палітычных партый 80–90-х гг. былі сканцэнтраваны на аналізе дадзенага крызісу сацыяльна-палітычнага інстытута.

У вывучэнні палітычных партый у палітычнай сацыялогіі выдзелілася два напрамкі: скептыкі, якія лічылі, што партыя як сацыяльна-палітычны інстытут будзе выцеснена масавымі грамадскімі арганізацыямі і рухамі,

якія будуць менш структураваныя-фармалізаваныя і стануць галоўнымі пасрэднікамі паміж людзьмі і дзяржавай: соцыум – арганізацыя – дзяржава (С. Бергер, К. Лоусон, П. Меркель, А Хайлек), і аптымісты, якія лічылі, што крызіс партый з’яўляецца часовым, і партыі застануцца важным палітычным інстытутам прадстаўнічай дэмакратыі пры істотнай змене іх ролі (К. Байме, А Панеб’янка, П. Майер).

У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. увага сацыёлагаў была звернута на вывучэнне і станаўленне палітычных партый у постсавецкіх краінах. Асаблівая ўвага надавалася інстытуту палітычных партый як элементу дэмакратызацыі палітычнага рэжыму. У палітычнай сацыялогіі з’явіўся новый кірунак – транзіталогія. Палітычныя партыі ў постсавецкіх краінах сталі разглядацца з пазіцый дэмакратычнага транзіту як запазычанне з ЗША і краін заходняй Еўропы. Уздзеянне знешніх фактараў і сацыяльных інстытутаў на развіццё палітычных партыі разглядалі Х. Візенталь і В. А. Марозаў. Яны мяркуюць, што парламенцкія сістэмы ўмацоўваюць палітычныя партыі і садзейнічаюць інстытуцыяналізацыі іх як сацыяльна-палітычнага інстытута, а прэзідэнцкія сістэмы, наадварот, вядуць да памяншэння ролі палітычных партый у палітычным полі краіны. У парламенцкіх сістэмах стабільнасць урада залежыць ад узроўню ўзаемадзеяння палітычных партый паміж сабой і ўрадам. У прэзідэнцкіх сістэмах функцыі парламента абмежаваныя заканадаўчай і прадстаўнічай дзейнасцю.

Даследчык Р. Інглхарт разглядае партыі ў сістэме постматэрыяльных каштоўнасцяў. Дзяленне на багатых – кансерватары, ліберальна настроеных – сярэдні клас, сацыяльна-дэмакратычныя і сацыялістычныя нізы. Ён меркаваў, што электарат, які мае невысокія даходы і нізкі ўзровень адукацыі, будзе найбольшы прыхільным да радыкальных і рэвалюцыйных змен палітычнай сістэмы. Высокаадукаваныя людзі з добрым дастаткам і значным сацыяльным статусам складуць электаральную базу партый кансерватыўнага толку ва ўмовах постіндустрыяльнага развіцця, а таксама шматпартыйных сістэм. Партыйная ідэнтыфікацыя, у большасці выпадкаў, успрымаецца выбаршчыкам не проста як псіхалагічная прыхільнасць, а як індывідуальная каштоўнасць, ад якой нялёгка адмовіцца нават тады, калі гэта неабходна для рэалізацыі яго рэальных інтарэсаў [17].

У Беларусі ў цяперашні час палітычная сацыялогія знаходзіцца на стадыі свайго станаўлення, і на вывучэнне палітычных партый як сацыяльна-палітычны інстытут беларускія сацыёлагі толькі пачынаюць звяртаць увагу.

Нешматлікія працы, напісаныя сацыёлагамі, якія закранаюць пытанні станаўлення палітычных партый, не даюць магчымасці сцвярджаць пра станаўленне айчыннай школы вывучэння палітычных партый з пазіцыі палітычнай сацыялогіі.

Такім чынам, агляд абагульняючых прац па палітычнай сацыялогіі паказвае, што сацыёлагі ў сваіх працах звярталі ўвагу на палітычныя партыі як на сацыяльна-палітычны інстытут краіны, які аб’яднаў частку палітычна

актыўнага насельніцтва якой-небудзь ідэалогіяй. Многія працы сацыёлагаў знаходзяцца на скрыжаванні паліталогіі і сацыялогіі, што абумовіла з’яўленне новага кірунку ў навуцы – палітычнай сацыялогіі. Разгледзеўшы гэтыя падыходы, мы робім выснову, што палітычная партыя – гэта сацыяльна-палітычны інстытут, які з’яўляецца структурным кампанентам палітычнай сістэмы і грамадзянскай супольнасці, яднаецца на добраахвотнай аснове палітыка-ідэалагічных аднадумцаў, мае арганізаваную структуру, статут і палітычную праграму, выказвае сацыяльна-палітычныя патрэбы, інтарэсы і памкненні сацыяльных груп, супольнасцяў або класаў і прымае актыўны ўдзел у палітычным і грамадскім жыцці. Некаторыя працы на сённяшні дзень ужо састарэлі, таму неабходна стварыць працы якасна новага ўзроўню, якія па-новаму будуць разглядаць партыі як якасны інстытут грамадзянская супольнасці. Адной з цэнтральных задач сучасных сацыёлагаў з’яўляецца комплекснае вывучэнне сістэмы шматпартыйнасці і сацыяльна-палітычных умоў яе функцыянавання. У гэты ракурс упісваецца вывучэнне гісторыі стварэння партый новай галіны навукі для Беларусі – палітычнай сацыялогіі. Айчыннымі сацыёлагамі толькі робяцца спробы выяўлення заканамернасці і інстытуцыяналізацыі палітычных партый з сацыялагічных пазіцый. Найбольш эфектыўна вядзецца вывучэнне палітычных партый у інтэгральных падыходах сацыялогіі і паліталогіі, філасофіі, псіхалогіі і інш.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Зотова, З. М.* Политические партии в России. Организация и деятельность / З. М. Зотова. – М., 2001 г.

2. Большой энциклопедический словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gufo.me/dict/politics_dict/Политическая_Партия. – Дата доступа: 01.10.2018.

3. *Юм, Д.* Сочинения. Of Parties in General / Д. Юм. – М.: Мысль, 1996. – Т. 2. – С. 511–518.

4. Congreso General de los Estados Unidos Mexicanos (23 de mayo de 2014), Ley General de Instituciones y Procedimientos Electorales. México: Diario Oicial de la Federación.

5. Alexis de Tocqueville. De la démocratie en Amérique [Электронный ресурс]. – Режим доступа: 01.10.2018.

6. *Острогорский, М.* Демократия и политические партии / М. Острогорский. – М.: Рос. полит. энцикл., 1997.

7. *Low, S.* The state system of England / S. Low. – London, 1908.

8. *Гамбаров, Ю. С.* Политические партии в их прошлом и настоящем / Ю. С. Гамбаров. – 2-е изд. – СПб.: Львович, 1904.

9. Karl Marx / Friedrich Engels. Die deutsche Ideologie. – M., 1846.

10. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений Т. 14, 15 «Опыт классификации русских политических партий» [Электронный ресурс] / В. И. Ленин. – Режим доступа: https://leninism.su/works/52-tom-14/2876-opyt-klassifikaczii-russkix-politicheskix-partij.html. – Дата доступа: 01.10.2018.

11. Politik als Beruf und Beruf. Max Weber Gesamtausgabe Bd. 17, hrsg. von Wolfgang J. – Mommsen, 1992.

12. Zur Soziologie des Parteiwesens in der modernen Demokratie by Robert Michels. – Published by Klinkhardt in Leiden, 1911.

13. *Duverger, M.* Les partis politiques / M. Duverger. – Paris, 1951.

14. *Lipset S. M.* Cleavage Structures, Party System, and Voter Alignments / S. M. Lipset, S. Rokkan // The West European Party System. – Oxford, 1990.
15. *Lawson, K.* The Comparative Study of Political Parties / K. Lawson. – N.Y., 1976.
16. *Russell, J.* Dalton, Citizen Politics / J. Russell. – 2nd ed. – P. 118.
17. *Inhart, R.* Culture Shift in Advanced Industrial Society / R. Inhart. – Princeton University Press, 1990.
18. Vie de Benjamin Constant // Constant B. Adolphe. Le cahier rouge. Cecile. – P., Gallimard, 1979.

**(Дата падачы: 07.12.2018 г.)**

*Т. В. Жмакина*
Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск

*T. Zhmakina*
Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК [321.7:16]**

## АРГУМЕНТАЦИЯ В ПОЛИТИЧЕСКОМ КОНТЕКСТЕ ДЕМОКРАТИИ

## ARGUMENTATION IN THE POLITICAL CONTEXT OF DEMOCRACY

*Готовность общества к проведению выборов является важным признаком его демократичности, способности мирными политическими средствами урегулировать политические конфликты и решать назревшие проблемы. Более предпочтительной формой властвования является демократия участия, которая функционирует как институциональная организационная система. Аргументация в политическом контексте демократии с учетом принципов и положений прагма-диалектической теории аргументации направлена на эффективное принятие решений исходя из исходных институциональных условий и дискурсивных механизмов, взаимодействие которых направлено на поиск разрешения конфликта мнений.*
*Ключевые слова: аргументация; институционализация; политический контекст; демократия; демократия участия; выборы.*

*Readiness of the society to hold elections indicates its democratic nature and the ability of the population to resolve conflicts and solve current problems by resorting to peaceful political means. Participatory democracy that functions as an institutional organization system is generally thought a more preferable form of rule and governing. Argumentation in the political context of democracy guided by the principles and norms of the pragma-dialectical theory of argumentation is aimed at effective decision-making regarding the institutional preconditions and discursive mechanisms the interaction of which is intended to resolve the difference of opinions.*
*Keywords: argumentation; institutionalization; political context; democracy; participatory democracy; elections.*

Демократия определяется как политический способ и определенная институциональная структура реализации политических – законодатель-